Падтрымай "Вясну" на PATREON

Рэха абароны Курапатаў: Яроменку прапанавалі адбыць даўні арышт

12.09.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Уладзь Яроменак пад час абароны Курапат. Фота: Беларускае Радыё Рацыя.

Актывіст "Маладога фронту" **Уладзь Яроменак** 8 верасня атрымаў судовую пастанову аб вынясенні арышту на 3 сутак за абарону Курапатаў, якая была арганізаваная актывістамі супраць будаўніцтва ў ахоўнай зоне напрыканцы лютага - пачатку сакавіка 2017 года.

Напярэдадні актывісту патэлефанаваў участковы інспектар міліцыі і нагадаў пра выкананне судовай пастановы, аднак Яроменак адказаў, што пакуль не атрымае яе асабіста, нічога рабіць не будзе.

Нагадаем, першапачаткова адміністратыўную справу планавалася разгледзець яшчэ ў сакавіку, аднак тады Уладзь Яроменак утрымліваўся пад вартай у СІЗА на Валадарскага, як падазроны па справе "аб падрыхтоўцы масавых беспарадкаў". Суд адбыўся 26 траўня, але актывісту не паведамілі ні пра дату суда, ні пра вынікі разгляду адміністратыўнай справы.

У пачатку сакавіка, калі падзеі вакол абароны Курапатаў набылі драматычны характар, некалькі абаронцаў атрымалі арышты. Так, 7 сакавіка абаронца Курапатаў **Сяргей Пальчэўскі** атрымаў 3 сутак арышту, а 10 сакавіка суд Савецкага раёна Мінска пакараў лідара "Маладога фронту" **Змітра Дашкевіча** арыштам на 3 сутак па арт. 23.34 КаАП. 20 сакавіка быў затрыманы сацыяльны актывіст **Дзмітрый Паліенка**. Суд Заводскага раёна г. Мінска прызнаў яго вінаватым па арт. 23.34 КаАП за ўдзел у абароне Курапатаў 25 лютага і асудзіла на 15 сутак арышту.

Варта дадаць, што дзякуючы кругласуткавай варце нераўнадушных людзей і актывістаў “Маладога фронту” тэрыторыю ўдалося адстаяць – будаўніцтва было згорнутае.

Твитнуть









"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY